Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

Зацвярджаю
Першы прарэктар УА “Беларускі
дзяржаўныуніверсітэт
культуры і мастацтваў ”
________________ Ю.П. Бондарь
“___” ____________ 2012г.
Рэгістрацыйны № УД ____ /баз

**САЦЫЯЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ**

*Вучэбная праграма для другой ступені*
*вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці*
*1-23 80 01 Бібліятэказнаўства,*
*бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**Складальнік:**

*Н.Ю. Вайцэховіч,*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Ляйко Н.А*, дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў, прафесар кандыдат гістарычных навук;

*Л.В.Гарбачова* загадчык інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 20.09.2012 г.);

*прэзідыўмам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 24. 09. 2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю

Адказны за выпуск *В.І.Саітава*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сацыялагічныя даследаванні актыўна выкарыстоўваюцца пры вывучэнні самых розных напрамкаў бібліятэчнай дзейнасці: камплектавання фондаў, каталагізацыі, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, бібліятэчнага маркетынга, кіравання бібліятэкай, метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці і інш. Ні адзін з гэтых накірункаў не абыходзіцца без пастаноўкі даследчых задач, якія могуць быць вырашаны толькі сацыялагічнымі метадамі. Яны могуць выкарыстоўвацца ў якасці асноўных ці дадатковых, у комплексе з іншымі (статыстычнымі, бібліяграфічнымі, маркетынгавымі, педагагічнымі) даследчымі метадамі. Адпаведна патрабаванні да якасці, карэктнасці і грунтоўнасці сацыялагічных кампанентаў магістарскага даследавання з кожным годам узрастаюць.

Вывучаючы курс “Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы”, магістранты засвойваюць веды і ўменні па арганізацыі і методыцы правядзення тэарэтыка-прыкладнога сацыялагічнага даследавання, што дае магчымасць правільна саставіць праграму даследавання, выбраць метад першаснага збору інфармацыі і шкалу вымярэння, сфарміраваць надзейную выбарку, саставіць анкету ў адпаведнасці з метадычнымі патрабаваннямі і карэктна правесці апытанне, прааналізаваць атрыманыя дадзеныя і сфармуліраваць вынікі.

Мэта дысцыпліны “Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы” – забяспечыць вывучэнне тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных і метадычных асноў правядзення сацыялагічных даследаванняў у бібліятэцы.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач:

– сфарміраваць веды па метадалогіі сацыялагічных даследаванняў;

– навучыць асноўным этапам правядзення сацыялагічнага даследавання, правілам складання праграмы даследавання;

– забяспечыць вувучэнне методыкі правядзення сацыялагічнага даследавання ў бібліятэцы, метадаў аналізу атрыманых дадзеных і кантролю іх надзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы” магістрант *павінен разумець і ведаць:*

– спецыфіку правядзення сацыялагічных даследаванняў у бібліятэцы, іх асноўныя накірункі і прынцыпы правядзення;

– класіфікацыю метадаў і тэхнік сацыялагічных даследаванняў;

– структуру і змест асноўных этапаў сацыялагічнага даследавання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– агульныя патрабаванні да тэарэтычнага і эмпірычнага блокаў праграмы даследавання;

– віды выбаркі і правілы яе фарміравання;

– способы праверкі працэдуры першаснага вымярэння на надзейнасць, віды шкал;

– метады збора дадзеных;

– методыку правядзення апытання, тыпы пытанняў, асноўныя прынцыпы пабудовы анкеты і патрабаванні да яе;

– методыку фарміравання фокус-груп і арганізацыі іх работы;

– способы аналізу эмпірычных дадзеных даследавання.

У выніку засваення гэтых ведаў магістрант павінен валодаць *наступнымі уменнямі:*

– планаваць сацыялагічнае даследаванне, фармуліраваць праблему, тэму, аб'ект, прадмет, мэту і задачы даследавання, абгрунтоўваць яго актуальнасць і навізну, фармуліраваць гіпотэзу;

– праводзіць папярэдні сістэмны аналіз аб'екта даследавання;

– складаць праграму даследавання;

– вызначаць метады збору інфармацыі;

– фарміраваць надзейную выбарку і карэктаваць яе;

– выбіраць шкалы вымярэння;

– складаць анкету ў адпаведнасці з метадычнымі патрабаваннямі, праводзіць апытанне, апрацоўваць атрыманыя дазеныя;

– кантраляваць надзейнасць першасных дадзеных на абгрунтаванасць, устойлівасць, дакладнасць;

– фарміраваць фокус-групы і арганізоўваць іх работу;

– групіраваць і тыпалагізаваць атрыманыя ў даследаванні дадзеныя, устанаўліваць ўзаемасувязі паміж зменнымі велічынямі;

– фармуліраваць і абгрунтоўваць вынікі даследавання.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння дысцыпліны "Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы" рэкамендуецца выкарыстоўваць тэхналогіі праблемнага і інтэрактыўнага навучання, камунікатыўныя тэхналогіі. У межах вывучэння курса прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі (уводныя, бягучыя, аглядныя, абагульняльныя), семінары (абмеркаванне дакладаў, семінар-дыскусія, семінар з элементамі лекцыі, семінар-даследаванне і г.д.), самастойная навуковая работа. Вывучэнне дысцыпліны разлічана на 38

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўдыторных гадзін: 22 – лекцыі, 16 – семінары. Выніковай формай кантролю ведаў з'яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лек. | сем. |
| ***Уводзіны*** | 0,5 | 0,5 | |
| **Раздзел I. Тэарэтыка-метадалагічныя і арганізацыйныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці** | | | |
| ***Тэма 1.*** Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэках: агульная характарыстыка | 1,5 | 1,5 | |
| ***Тэма 2.*** Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Праграма сацыялагічнага даследавання | 10 | 6 | 4 |
| **Раздзел II. Методыка правядзення сацыялагічнага даследавання ў бібліятэцы** | | | |
| ***Тэма 4.*** Першаснае вымярэнне сацыяльных характарыстык і методыка збора дадзеных | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 5.*** Методыка правядзення апытання | 8 | 4 | 4 |
| ***Тэма 6.*** Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Аналіз эмпірычных дадзеных сацыялагічнага даследавання | 4 | 2 | 2 |
| **Усяго** | **38** | **22** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы курса “Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы”. Кампетэнцыі, якія набываюць магістранты ў працэсе вывучэння курса. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы. Вучэбна-метадычная забяспечанасць курса.

## РАЗДЗЕЛ І. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### *Тэма 1. Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэках: агульная характарыстыка*

Гісторыя бібліятэчнай сацыялогіі. Сучасныя накірункі сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці. Прымяненне сацыялагічных метадаў для дыягностыкі інфармацыйных патрэб карыстальнікаў бібліятэк; вывучэння чытання; фарміравання і выкарыстоўвання бібліятэчных фондаў; аналізу развіцця інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі; вывучэння арганізацыі і кіравання бібліятэчнай дзейнасцю і інш. Задачы сацыялагічных даследаванняў у бібліятэках і агульныя патрабаванні да іх.

### *Тэма 2. Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці*

Паняцце сацыяльнага факта і сацыяльнай сістэмы. Бібліятэка як сацыяльная сістэма. Прынцыпы бібліятэчнай сацыялогіі: сацыякультурнай абумоўленасці; адноснай самастойнасці бібліятэчнай дзейнасці; дыялагічнасці адносін паміж бібліятэкай і карыстальнікамі; індывідуалізацыі.

Тыпалогія сацыялагічных даследаванняў. Тэарэтыка-прыкладное і прыкладное даследаванні. Разведвальнае, апісальнае, аналітычнае і параўнальнае даследаванні.

Класіфікацыя метадаў і тэхнік сацыялагагічных даследаванняў. Метады збора першаснай інфармацыі аб сацыяльных фактах: назіранне, вывучэнне дакументаў, апытанне. Сістэма збора дадзеных: даследаванні манаграфічныя, суцэльныя, выбарачныя. Метады аналіза першаснай інфармацыі. Апісанне і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класіфікацыя. Тыпалагізацыя. Статыстычны аналіз (пошук статыстычнай заканамернасці). Эксперыментальны аналіз. Сістэмны аналіз. Гістарычны (генетычны) аналіз. Сацыяльные мадэліраванне.

### *Тэма 3. Праграма сацыялагічнага даследавання*

Тэарэтычны блок праграмы. Вызначэнне праблемы, аб'екта і прадмета даследавання. Фармуліраванне мэты і задач даследавання. Удакладненне і інтэрпрэтацыя асноўных паняццяў. Папярэдні сістэмны аналіз аб'екта даследавання. Вызначэнне і разгортванне гіпотэз даследавання. Складанне стратэгічнага плана даследавання.

Эмпірычны блок праграмы. Вызначэнне метадаў збора інфармацыі. Распрацоўка метадычнага інструментарыя. Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання. Віды выбаркі. Аб'ём выбаркі. Тыпавыя памылкі пры фарміраванні выбаркі і спосабы яе карэкцыі. Метады апрацоўкі і інтэрпрэтацыі дадзеных.

Агульныя патрабаванні да праграмы даследавання.

## РАЗДЗЕЛ II. МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ САЦЫЯЛАГІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

### *Тэма 4. Першаснае вымярэнне сацыяльных характарыстык і методыка збора дадзеных*

Выбар шкалы вымярэння. Спосабы праверкі працэдуры першаснага вымярэння на надзейнасць. Агульная характарыстыка шкал. Простая намінальная шкала. Часткова-ўпарадкаваная шкала. Парадкавая шкала. Шкала прапарцыянальных ацэнак.

Метады збора дадзеных. Прамое назіранне. Аналіз дакументных крыніц. Анкетныя апытанні і інтэрв'ю. Псіхалагічныя працэдуры правядзення сацыялагічнага даследавання.

### *Тэма 5. Методыка правядзення апытання*

Сутнасць і магчымасці метадаў апытання для даследаванняў бібліятэчна-бібліяграфічных з'яў. Анкетаванне і інтэрвьюіраванне, параўнальныя магчымасці метадаў, іх перавагі і недахопы. Вызначэнне віду апытання. Распрацоўка метадычнага інструментарыя. Структура анкеты. Афармленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

анкеты. Асноўныя прынцыпы пабудовы анкеты. Тыпы пытанняў і інтэрпрэтацыя адказаў. Апрабіраванне анкеты.

Інтэрвьюіраванне, яго віды. Патэкставае рэтраспектыўнае інтэрвью, методыка. Апрацоўка і інтэрпрэтацыя дадзеных, способы карэкцыі.

### *Тэма 6. Выкарыстанне метадаў экспертных ацэнак і фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці*

Сутнасць і задачы экспертных метадаў пры даследаванні сацыялагічных працэсаў і фактаў. Экспертныя ацэнкі якасці аб’кта даследавання, методыка і абгрунтаванне вынікаў. Метады экспертных ацэнак у прагназаванні развіцця бібліятэчных аб’ектаў. Група спецыялістаў-аналітыкаў. Фарміраванне групы экспертаў. Падрыхтоўка апытання экспертаў. Віды экспертных ацэнак. Апрацоўка і абгрунтаванне вынікаў экспертных ацэнак.

Сутнасць метаду фокус-груп, Фокус-групы ў структуры колькаснага даследавання. Фарміраванне фокус-груп. Арганізацыя правядзення фокус-груп. Функцыі мадэратара. Работа фокус-групы. Кіраванне групавым працэсам. Аналіз вынікаў работы фокус-групы.

### *Тэма 7. Аналіз эмпірычных дадзеных*

Групіроўка і тыпалагізацыя. Пошук узаемасувязяў паміж зменнымі велічынямі. Сацыяльны эксперымент – метад праверкі навуковай гіпотэзы. Аналіз дадзеных паўторных і параўнальных даследаванняў.

Паслядоўнасць дзеянняў пры аналізе дадзеных. Прыёмы кантролю надзейнасці першасных дадзеных на абгрунтаванасць; устойлівасць; дакладнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Брофи, Питер. Оценка деятельности библиотек: принципы и методы / Питер Брофи ; науч. ред. пер. Я.Л. Шрайберг. – Москва : Омега-Л, 2009. – 357 с.
2. Васильев, И.Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И.Г. Васильев, М.Е. Илле, Д.К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
3. Добреньков, В.И Методы социологического исследования : учеб. по специальности 020300 "Социология" / В.И. Добреньков, А.И. Кравченко. – Москва : Инфра-М, 2009. – 767 с.
4. Крейденко, В.С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В.С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
5. Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : (метод. рек.) / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, Науч.-метод. отд. ; [сост. Н.А. Скрябина]. – Киров : Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, 2010. – 55 с.
6. Социологические исследования в библиотеке: теоретический и практический аспекты [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси ; составитель М.Г. Алейник; редактор О.А. Соболевская. – Минск : НББ, 2006. – 26,5 Мб. – 1 электронный оптический диск (CD-ROM).
7. Тавокин, Е.П. Основы методики социологического исследования / Е.П. Тавокин : учеб. пособие для высш. учеб. заведений по специальности 040201 "Социология". – Москва : Инфра-М, 2009. – 236 с.

*Дадатковая*

1. Алейник, М.Г. Социологические исследования в Национальной библиотеке Беларуси / М.Г. Алейник // Библиотечное дело-2002. Библиотечное образование и практика: поиски взаимопонимания. – Москва, 2002. – С. 81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Девятко, И.Ф. Методы социологического исследования : учеб. пособие для высш. учеб. заведений по специальности 040201 "Социология" и 040102 "Социальная антропология" / И.Ф. Девятко. – Москва : Книжный дом, 2006. – 293 с.
3. Кононенко, И.М. Маркетинговые и социологические исследования в библиотеках МУК "ЦБС г. Саратова": современное состояние, тенденцiи развития / И.М. Кононенко // Исследовательские проекты библиотек по чтению. – Санкт-Петербург : Российская национальная библиотека, 2007. – С. 103–110.
4. Кротюк, Н.И. Белорусская книга и ее читатель. Опыт социологического исследования / Респ. правление Бел. о-ва "Книга". – Минск, 1990. – 52 с.
5. Кузнецов, И.Н. Технологии социологического исследования : учеб.-метод. пособие / И.Н. Кузнецов. – Москва : МарТ, 2005. – 142 с.
6. Летуновский, С.Б. Методика проведения социологических исследований : лекция по социологии / [Сост. С.Б. Летуновский] ; Центросоюз Рос. Федерации, Моск. ун-т потребит. кооп. Сар. кооп. ин-т МУПК. – Москва ; Саранск, 2001. –15 с.
7. Методика эмпирического социологического исследования : метод. разраб. / Витеб. гос. технол. ун-т ; [сост. Е.И. Мальченков]. – Витебск : ВГТУ, 1999. – 45 с.
8. Потапова, Р.П. Библиотерапевтическое направление социальной поддержки молодежи: состояние, проблемы, перспективы развития : опыт социологического исследования : автореф. дис. … канд. социол. наук: 22.00.04 / Р.С. Потапова ; [Алтайс. гос. ун-т]. – Барнаул, 2005. – 18 с.
9. Ядов, В.А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В.А. Ядов в сотрудничестве с В.В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ